

# «РАКЕТАБУДАВАННЕ МЫ СТВАРЫЛІ ЛІТАРАЛЬНА З «НУЛЯ». ТРЭБА ВЫЗНАЧЫЦЦА, КУДЫ І ЯК БУДЗЕМ РУХАЦЦА»

**Развіццё важнай для нацыянальнай бяспекі галіны — тэма абмеркавання на нарадзе ў Прэзідэнта**

(Стар. 2–3)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

22 ЖНІЎНЯ 2025 г. ПЯТНІЦА № 161 (30549)

# ЗАХАВАЦЬ СМАК ЛЕТА





Нарыхтоўчая кампанія набірае абароты

Кожны сезон зямля шчодра аддае свае скарбы, а людзі з любоўю і ўважлівасцю збіраюць плён сваёй працы. Ад садоў і агародаў гарадскіх жыхароў да далёкіх вёсачак — кожная ягадка, кожная бульбіна нясуць у сабе частку душы гаспадара і водар роднай зямлі. Вядома, што хочацца захаваць. А з дзяржаўнага пункта гледжання захаванне і нарыхтоўка гародніны і дзікаросаў — гэта важны складнік харчовай бяспекі. Таму і арганізацыя іх прыёму ад насельніцтва — справа дзяржаўная. І ўвага гэтаму адпаведная.

СТАР. 6



«АЛІЎЕ» — З АЙЧЫННАГА ГАРОШКУ 5



АСЦЯРОЖНА: ШКОЛЬНІКІ ВЯРТАЮЦЦА З КАНІКУЛ 10



**+TV ПРАГРАМА**

«ЖЭНЯ, ЖЭНЕЧКА І «КАЦЮША»

**Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby.**

**Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!**

ВЯЛІКАЯ ПЕРАМЕНА

## ДРЭС-КОД ДЛЯ ШКАЛЯРА

**Або ці лёгка сабраць дзіця да школы**

З гэтага навучальнага года беларускія школьнікі пяройдуць на дзелавы стыль адзення. Айчынны легпрам сёння прапануе для іх калекцыі на любы густ і колер. Шырокі выбар пазіцый у пастаўшчыкоў з Расіі, краін СНД, Кітая, Турцыі. Абутак і ўсё астатняе таксама падабраць не праблема. Тыдзень назад журналіст «Звязды» разам са спецыялістамі інспекцыі Дзяржнагляду па Магілёўскай вобласці правяралі якасць тавару (глядзі № 157 ад 16 жніўня). Гэтым разам нас цікавіў цэнавы фактар і, каб знайсці аптымальныя варыянты, мы пабывалі на школьным рынку Магілёва, наведалі крамы, пагутарылі з зацікаўленымі. Дзелімся вопытам.

СТАР. 8–9



ISSN 1990 — 763X

25161>

# «РАКЕТАБУДАВАННЕ МЫ СТВАРЫЛІ ЛІТАРАЛЬНА ТРЭБА ВЫЗНАЧЫЦЦА, КУДЫ І ЯК БУДЗЕМ

## Развіццё важнай для нацыянальнай бяспекі галіны — тэма абмеркавання

Сур'ёзная размова з нагоды далейшых крокаў па развіцці новай галіны ў Беларусі адбылася ў Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з адказнымі за сферу спецыялістамі.




«Дынаміка ўзроўню ваенных пагроз і істотнае павелічэнне нашымі заходнімі суседзямі ваенных выдаткаў прымушае нас пастаянна надаваць самую пільную ўвагу пытанню абараназдольнасці Беларусі, Расіі, нашага Саюза», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Ён расказаў, што ў чэрвені гэтага года прыняты шэраг рашэнняў у частцы далейшага развіцця беспілотных авіяцыйных комплексаў, якія ўсё больш і больш дамінуюць на полі бою.

Ракетабудаванне — галіна для нашай краіны новая, і сённяшняя нарада прысвечана пытанням яе развіцця і мадэрнізацыі.

**«Як і беспілотная авіяцыя, дадзеная галіна адносна маладая для ВПК. Стварылі мы яе літаральна з нуля, нешта дасягнулі, нешта не атрымалася ці не атрымліваецца. Як і ў астатніх сектарах эканомікі мы дзейнічаем максімальна эфектыўна, зыходзячы з наяўных фінансавых рэсурсаў.**



**Сёння мы павінны вызначыцца, куды і як будзем рухацца далей па гэтым напрамку, улічваючы формы і метады вядзення баявых дзеянняў у сучасных умовах», — задаў тон размовы кіраўнік дзяржавы.**

**У ходзе нарады Аляксандр Лукашэнка праанансаваў свой візіт у Кітай, які абудзецца ў хуткім часе.** Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што абмеркаванне тэмы ракетабудавання напярэдадні мае вялікае значэнне.

**«Гэта важна яшчэ і ў сувязі з маім візітам у Кітайскую Народную Рэспубліку і размовай са Старшынёй КНР Сі Цзіньпінам (у нас такая сустрэча плануецца).**

**Чаму? Таму што пачыналі мы, працягвалі ракетабудаванне ў цеснай сувязі з кітайскім ваенна-прамысловым комплексам, і цяпер у нас ёсць кантакты», — растлумачыў беларускі лідар.**

Раней паведамлялася, што старшыня КНР Сі Цзіньпін запрасіў Прэзідэнта Беларусі на саміт Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва і парад у Пекіне, якія пройдуць у канцы жніўня — пачатку верасня. Парад у Пекіне прымеркаваны да 80-й гадавіны Перамогі ў вайне супраціўлення кітайскага народа японскай агрэсіі і сусветнай антыфашысцкай вайне.

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што плануе абмеркаваць гэтыя пытанні, вынесеныя на нараду, і са сваім расійскім калегам.

«Я параюся з Прэзідэнтам Расіі, якім чынам будзем дзейнічаць сумесна і ці цікавыя Расійскай Федэрацыі будуць нашы прапановы і далейшыя крокі па мадэрнізацыі і стварэнні ракетнай вытворчасці ўнутры нашага Саюза», — сказаў ён.

### Даслоўна

### «МЫ ВЕЛЬМІ ШМАТ ПРАЦАВАЛІ НАД ФАКТЫЧНА СТВАРЭННЕМ ШКОЛЫ РАКЕТАБУДАВАННЯ»

**Старшыня Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта Дзмітрый ПАНТУС** расказаў, што кіраўніку дзяржавы далажылі аб выніках работы ў галіне ракетабудавання за апошнія пяць гадоў. «Я нагадаю, што былі досыць паспяховыя праекты ў гэтым плане — зенітна-ракетны комплекс «Бук-МБ2», які прыняты на ўзбраенне ва Узброеных Сілах з першай айчыннай зенітна кіраванай ракетай далёкасцю больш за 70 кіламетраў. Сёння комплекс серыйна выпрацоўваецца і цікавасць да яго вялікая. У гэтай пяцігодцы нам удалося завяршыць праект па гранатамётным комплексе «Сапфір». Мы вельмі шмат працавалі над фактычна стварэннем школы ракетабудавання. Мы працягвалі работу па навучанні спецыялістаў, у тым ліку і ў Расійскай Федэрацыі, па вузкаспецыялізаваных спецыяльнасцях. Сёння спецыялісты ўжо прыбылі да нас і працуюць на нашых прадпрыемствах. Гэта работа будзе працягнутая», — адзначыў Дзмітрый Пантус. Таксама на нарадзе старшыня ВПК далажыў Прэзідэнту аб патэнцыяльных праектах на будучыню.



# З «НУЛЯ». РУХАЦЦА»

## на нарадзе ў Прэзідэнта

**Даслоўна**

Нарада па зразумелых прычынах насіла закрыты характар, але яе ўдзельнікі раскрылі журналістам некаторыя падрабязнасці размовы па тэме ракетабудавання.

### «СЁННЯ ПАЎСТАЮЦЬ ПЫТАННІ АБ АСНАШЧЭННІ РАКЕТ І ЯДЗЕРНЫМІ БОЕГАЛОЎКАМІ Ў ТЫМ ЛІКУ»

**Дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ** адзначыў, што дынаміка сучасных ваенных пагроз сёння зашкальвае, у нашых суседзяў назіраецца істотнае павелічэнне выдаткаў на абарону, павышаная ўвага да пытанняў мілітарызацыі, каля нашых заходніх граніц назіраецца ваенная актыўнасць. «Усё гэта прымушае нас па-асабліваму глядзець на пытанні абараназдольнасці нашай дзяржавы. Як кажа Прэзідэнт, мы нікому не пагражаем, але, што тычыцца абароны нашай дзяржавы, нашых нацыянальных інтарэсаў і нашага народа, — гэта ў аснове ўсяго. І пытанні, звязаныя з павышэннем нашай абараназдольнасці, надзвычай важныя. На першы план тут выходзяць пытанні стратэгічнага стрымлівання, стратэгічнай зброі. Сюды адносяцца пытанні, звязаныя з ракетнай вытворчасцю. Ракетныя войскі, артылерыя — гэта адзін з найважнейшых складнікаў нашых Узброеных Сіл, і яны павінны адпавядаць патрабаванням часу і быць здольнымі выканаць задачы ў адпаведнасці з новымі формамі і спосабамі баявых дзеянняў, якія мы ўзмоцнена вывучаем», — распавёў Аляксандр Вальфовіч.

Паводле яго слоў, нарада ў Прэзідэнта была прысвечана стварэнню ракетнай вытворчасці. Кіраўніку дзяржавы далажылі аб аспектах асваення праграмы па ракетнай вытворчасці ў нашай краіне, якая завяршаецца сёлета. Праграма была прынята ў 2020 годзе на пяцігадовы тэрмін. «Пяць гадоў таму мы пачыналі з нуля. У нашай краіне ніколі не было ракетнай вытворчасці. Нам гэта было не трэба, мы мірная краіна, вырабляем трактары, аўтобусы. Але жыццё падштурхоўвае да таго, што кожная дзяржава павінна думаць аб пытаннях абараназдольнасці. Таму была прынята пастанова аб стварэнні ўласных ракет», — нагадаў гісторыю пытання дзяржаўны сакратар. Разам з расійскімі, кітайскімі партнёрамі былі створаны адпаведныя напрацоўкі, якія ўжо добра сябе зарэкамендавалі.



«Сёння паўстаюць пытанні аб аснашчэнні ракет і ядзернымі боегалоўкамі ў тым ліку», — сказаў Аляксандр Вальфовіч. Ён паведаміў, што разглядаецца пытанне аб аснашчэнні такімі боегалоўкамі ракетнага комплексу «Паланез». Аляксандр Вальфовіч звярнуў увагу, што гэты ракетны комплекс быў створаны сумесна з Кітайскай Народнай Рэспублікай. Пазней ён быў паспяхова мадэрнізаваны ўжо на беларускіх прадпрыемствах. «Сёння гэта сучасны комплекс. Далёкасць ракеты была 200 км, сёння гэта ракеты (далёкасцю. — «**Зв».**) 300 км. Гэта высокадакладная зброя. Вядома ж, любая зброя патрабуе карэкціроўкі, унясення змяненняў. Пытанні аснашчэння гэтых ракет ядзернымі боегалоўкамі ўжо ставяцца. І як інтэграваць тэхналогіі «Арэшніка», можа быць, у нейкія ракеты сумесныя. Як сумесна ўжо з расійскім бокам карэкціраваць і працаваць у гэтым напрамку, ствараючы сучасную ракету», — сказаў дзяржсакратар Савета бяспекі. «Гэта не дзеля пагроз камусьці. Мы глядзім, як ЗША, заходнія краіны ствараюць аналагічныя комплексы з далёкасцю 600 і больш кіламетраў. Трэба паспяваць і ісці ў гэтым кірунку», — перакананы Аляксандр Вальфовіч.

Па ўсіх гэтых пазіцыях Прэзідэнт задаваў прынцыповыя пытанні на нарадзе. Кіраўнік дзяржавы паглыблены ў гэтую тэму, таму актыўна цікавіўся ўсімі аспектамі. «Прэзідэнт паставіў задачу паглядзець, што наогул зроблена па сучасных відах узбраення нашым ваенна-прамысловым комплексам, і яго праінфармаваць, куды далей рухацца, што трэба карэкціраваць. Пастаўленыя задачы не спыняцца, рухацца наперад», — распавёў дзяржаўны сакратар.

**Валерыя СЦЯЦКО. Фота БелТА.**

АКТУАЛЬНА

# ПЫТАННІ, ВАЖНЫЯ ДЛЯ ЭКАНОМІКІ

## Асобныя тэмы развіцця АПК разгледзелі на нарадзе ў Прэм'ер-міністра Аляксандра Турчына

Як паведамілі ў прэс-службе ўрада, у цэнтры ўвагі ўдзельнікаў былі такія пытанні, як развіццё свінагадоўлі, павышэнне эфектыўнасці адкорму буйной рагатай жывёлы за кошт будаўніцтва спецыялізаваных комплексаў, а таксама развіццё малакаперапрацоўчай прамысловасці.

Учора ў графіку Прэм'ер-міністра было яшчэ адно мерапрыемства — ён правёў рабочую нараду на базе Інстытута парашковай металургіі.



БАЯВАЯ ПАДРЫХТОЎКА

# ДЗЕЛЯ МІРУ І СТАБІЛЬНАСЦІ Ў РЭГІЁНЕ

## Больш за 5 тысяч ваеннаслужачых і каля тысячы адзінак тэхнікі будзе задзейнічана ў сумесных вучэннях АДКБ у 2025 годзе

Аб гэтым падчас брыфінгу па тэме «Аб гатоўнасці органаў кіравання і фарміраванняў сіл і сродкаў сістэмы калектыўнай АДКБ да правядзення сумесных вучэнняў» заявіў начальнік Аб'яднанага штаба АДКБ генерал-палкоўнік Андрэй Сердзюкоў. Ён заўважыў, што сумесная падрыхтоўка ў 2025 годзе праходзіць ва ўмовах складанай ваенна-палітычнай абстаноўкі, падкрэсліўшы, што ўсе мерапрыемствы, якія праводзяцца, з'яўляюцца планавымі, не накіраваны супраць трэціх краін.

Асноўным мерапрыемствам аператыўнай і баявой падрыхтоўкі ў пачатку верасня стане сумеснае вучэнне з Калектыўнымі сіламі аператыўнага рэагавання «Узаемадзеянне-2025», якое пройдзе на палігонах Лосвіда і Лепельскі. У рамках падрыхтоўкі да яго будуць праведзены спецыяльныя вучэнні з сіламі і сродкамі разведкі «Пошук-2025» і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння «Эшалон-2025». Адзначаецца, што задумы гэтых вучэнняў цесна ўвязаны з задумай сумеснага стратэгічнага вучэння Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі «Захад-2025». Асноўная задача Калектыўных сіл аператыўнага рэагавання — забеспячэнне разгортвання рэгіянальнай групоўкі войск.

У верасні на тэрыторыі Кыргызстана, на базе навучальнага трэніровачнага цэнтра «Эдэльвейс», пройдзе камандна-штабное вучэнне «Рубеж-2025» з падраздзяленнямі Калектыўных сіл хуткага разгортвання Цэнтральна-азіяцкага рэгіёна. У кастрычніку на палігоне Фахрабад у Таджыкістане плануецца правядзенне сумеснага вучэння з Міратворчымі сіламі АДКБ «Непарушнае братэрства — 2025». Упершыню ў рамках міратворчага вучэння будзе праведзена спецыяльнае вучэнне з сумесным фарміраваннем РХБ абароны і медыцынскага забеспячэння «Бар'ер-2025», дзе плануецца адпрацоўка задач па ліквідацыі біялагічных пагроз у інтарэсах Калектыўных міратворчых сіл. Актыўныя фазы гэтых вучэнняў будуць праводзіцца ў сумешчаным фармаце з заключным этапам сумеснага антытэрарыстычнага вучэння кампетэнтных органаў дзяржаў — удзельніц СНД «Садружнасць-Антытэрор — 2025».

Як адзначыў начальнік Аб'яднанага штаба АДКБ, у ходзе ўсіх вучэнняў спланавана правядзенне даследаванняў па актуальных пытаннях павышэння эфектыўнасці прымянення Калектыўных сіл, з прыцягненнем профільных спецыялістаў ад базавых навучальна-метадычных і навукова-даследчых арганізацый краін АДКБ.

Практычныя мерапрыемствы па вылучэнні нацыянальных кантынгентаў у раёны правядзення вучэнняў ужо пачаліся. Войскі і тэхніка дастаўляюцца на палігоны ваенна-транспартнай авіяцыяй, чыгуначным і аўтамабільным транспартам. «Улічваючы аб'ём выкананых задач і праведзеных мерапрыемстваў, упэўнены, што сумесныя вучэнні будуць праведзены арганізавана і якасна, а вучэбныя і даследчыя мэты — дасягнуты, — падкрэсліў Андрэй Сердзюкоў. — Калектыўныя сілы пакажуць высокую палявую вывучку і зладжанасць дзеянняў. Мерапрыемствы, якія праводзяцца арганізацыяй, з'яўляюцца асновай на ўмацаванні міру, міжнароднай і рэгіянальнай бяспекі і стабільнасці, абароны на калектыўнай аснове незалежнасці, тэрытарыяльнай цэласнасці і суверэнітэту нашых дзяржаў, прыярытэт у дасягненні якіх дзяржавы-члены аддаюць палітычным сродкам».

**Паводле Мінабароны.**

КАНСТРУКТЫЎНЫ ДЫЯЛОГ

# УНІКАЛЬНЫЯ КАМПЕТЭНЦЫІ І МАГУТНЫ НАВУКОВЫ ПАТЭНЦЫЯЛ

**Педагагічная супольнасць гатова ўзаемадзейнічаць з заканадаўцамі ў адукацыйнай плоскасці**



Напярэдадні новага навучальнага года Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА наведаў Акадэмію адукацыі, дзе азнаёміўся са спецыфікай дзейнасці ўстановы дадатковай адукацыі дарослых, пагутарыў з калектывам і слухачамі. Акрамя таго, спікеру прадэманстравалі вучэбныя выданні, падрыхтаваныя да 2025/2026 навучальнага года.

Сярод іх — падручнікі для навучэнцаў з парушэннямі зроку, слыху, са складанымі парушэннямі маўлення і цяжкасцямі ў навучанні, для навучэнцаў з інтэлектуальнай недастатковасцю. Як кажуць спецыялісты, аналагаў унікальным выданням, створаным супрацоўнікамі акадэміі пры дапамозе шрыфту Брайля, няма на постсавецкай прасторы. Наўрад ці гэтым пахваляцца і на Захадзе. Наша дзяржава не шкадуе сродкаў на спецыяльную кніжную прадукцыю. А ўсё для таго, каб кожны жыхар Беларусі, нягледзячы на пэўныя праблемы са здароўем, мог атрымаць своечасовую і якасную адукацыю. Тым больш, унікальнымі кампетэнцыямі ў гэтым плане валодае і Акадэмія адукацыі.

## ДАТЫЧЫЦЦА КОЖНАЙ СЯМ'І

«Напэўна, сёння няма ні адной сям'і ў нашай краіне, якую б не закранаў пытанні адукацыйнай сферы: вучобы ў школе, сярэдне-спецыяльнай або вышэйшай навучальнай установе, — звярнуў увагу Старшыня Палаты прадстаўнікоў. — Больш за мільён дзяцей сёлета пойдзе ў школу, звыш 220 тысяч студэнтаў. У цэлым у адукацыйнай сферы — і навучэнцаў, і тых, хто працуе, — задзейнічана каля 2 мільёнаў чалавек. Калі сюды дадаць яшчэ сваякоў навучэнцаў і тых, хто так ці інакш звязаны з забеспячэннем навучальнага працэсу, атрымаецца амаль уся краіна».

Кажучы аб Акадэміі адукацыі, спікер адзначыў, што ўстанова валодае магутнай матэрыяльна-тэхнічнай базай, моцным навуковым патэнцыялам. «У калектыве працуюць дактары і кандыдаты навук, — падкрэсліў ён. — Навучальная ўстанова жыве і развіваецца. І самае галоўнае, вы ствараеце падручнікі па многіх прадметах, рэалізуючы тыя задумы, якія планаваліся Міністэрствам адукацыі ў мінулыя гады. Перападрыхтоўка педагагічнага складу па шматлікіх кірунках — асноўнае ў вашай рабоце».

Установа дадатковай адукацыі дарослых была створана ў лютым 2024 года шляхам аб'яднання Нацыянальнага інстытута адукацыі Міністэрства адукацыі і Акадэміі паслядыпломнай адукацыі. Супрацоўнікі ўстановы ажыццяўляюць фундаментальныя і прыкладныя навуковыя даследаванні ў сферы адукацыі, рэалізуюць адукацыйныя праграмы павышэння кваліфікацыі, перападрыхтоўкі і стажыроўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў. Вопытныя педагогі, якія працуюць у акадэміі, распрацоўваюць вучэбныя выданні для ўстаноў дашкольнай, агульнай сярэдняй, спецыяльнай адукацыі, дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі. Сярод задач калектыву ў 400 чалавек — навукова-метадычнае забеспячэнне выхаваўчай работы ва ўстановах дашкольнай, агульнай сярэдняй і спецыяльнай адукацыі, навукова-метадычнае суправаджэнне эксперыментальнай і інавацыйнай дзейнасці ў сферы адукацыі.

Акадэмія адукацыі дарослых гатова да пачатку новага навучальнага года. «Падрыхтаваны метадычныя рэкамендацыі, інструкцыйна-метадычныя лісты, вучэбныя выданні, — канкрэтызавала **рэктар Акадэміі адукацыі Ірына СТАРАВОЙТАВА**. — Выдадзена каля 30 вучэбных выданняў, два з іх — абсалютна новыя: «Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай» для 11 класа і «Асновы бяспечнай жыццядзейнасці» для 3 класа. У падручніку «Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай» упершыню прадстаўлены матэрыял аб развіцці суверэннай Беларусі, аб ролі Прэзідэнта ў станаўленні нашай краіны. У кожным вучэбным выданні ёсць новыя рубрыкі, якія датычацца дасягненняў, рэалізаваных нашай краінай у розных сферах: адукацыі, навуцы, культуры, сельскай гаспадарцы, прамысловасці і іншых».

Акрамя таго, Акадэміяй адукацыі падрыхтавана звыш 30 вучэбных дапаможнікаў для ўстаноў сярэдне-спецыяльнай адукацыі і столькі ж — вучэбна-метадычных дапаможнікаў для педагогаў. Што датычыцца перападрыхтоўкі кадраў, Ірына Старавойтава паведаміла, што колькасць слухачоў з кожным годам павялічваецца. «Наша задача — стварыць адукацыйнае асяроддзе для тых педагогаў, якія гатовы атрымліваць новыя кампетэнцыі», — адзначыла рэктар.

## УДАСКАНАЛЬВАЦЦА БЕЗ ЭКСПЕРЫМЕНТАЎ

Старшыня Палаты прадстаўнікоў падкрэсліў, што кіраўнік дзяржавы ўдзяляе павышаную ўвагу сістэме адукацыі. «Эксперыменты скончыліся, — канстатаваў Ігар Сергяенка. — Патрэбна ісці, рухацца па тым шляху, які ўжо апрабаваны, і ўдасканальвацца, але не мяняючы і не ламаючы нічога прынцыпова».

Спікер расказаў аб дзейнасці Палаты прадстаўнікоў, падрабязна спыніўся на апошніх законапраектах, якія датычацца адукацыйнай сферы. Нагадаў аб змяненнях у Кодэкс аб адукацыі, якія ўступяць у сілу 1 верасня. У прыватнасці, аўтобусы, што знаходзяцца на балансе школ, цяпер могуць быць задзейнічаны не толькі для падвозу навучэнцаў да ўстановы адукацыі і дадому, а і з мэтай дастаўкі школьнікаў на спартыўныя, культурныя, іншыя мерапрыемствы. «Гэта тое, чаго чакалі на месцах», — акцэнтаваў увагу Ігар Сергяенка і расказаў аб змяненнях, якія прадугледжаны заканадаўствам па пытаннях забеспячэння праваў дзяцей.

У размове з журналістамі Старшыня Палаты прадстаўнікоў падкрэсліў, што перад сістэмай адукацыі ў першую чаргу стаяць задачы па падрыхтоўцы высокаадукаваных маладых людзей. Па яго словах, многае робіцца ў плане стварэння і паляпшэння матэрыяльна-тэхнічнай базы навучальных устаноў, уводзяцца ў эксплуатацыю новыя аб'екты, але важным і галоўным у гэтым працэсе заўсёды быў і застаецца педагог. «Ад яго пазіцыі, падрыхтоўкі, адносін да сваёй прафесіі сёння залежыць і тое, якімі пасля школы выйдуць нашы дзеці, дзеці нашай краіны», — перакананы спікер.

Ігар Сергяенка адзначыў, што агучаныя падчас сустрэчы прапановы ад педагагічнай супольнасці, якія, у прыватнасці, датычацца стварэння канцэпцыі патрыятычнага выхавання ў краіне, разгляду пытанняў адказнасці за фальсіфікацыю гісторыі, ідуць ад жыцця. А таму заканадаўцам будзе над чым папрацаваць.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**

ПРЫРОДА І МЫ

# ГРАМАДСТВА СТАНОВІЦЦА БОЛЬШ ЭКАЛАГІЧНА АДКАЗНЫМ




Падведзены вынікі III Міжнароднай спецыялізаванай экалагічнай выставы Ecology Expo — 2025. За два з паловай дні яе наведалі больш за 5000 чалавек.

— Любая выстава, якая сёння праходзіць у Беларусі, — пацвярджэнне незалежнасці і суверэнітэту нашай краіны, — адзначыў на ўрачыстай цырымоніі закрыцця **міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Сяргей МАСЛЯК**. — Гэта паказчык таго, чаго тая ці іншая галіна эканомікі дабілася за перыяд сваёй працы, яе планы на будучыню. І адначасова пляцоўка для дэманстрацыі самых перадавых інавацыйных рашэнняў.

Кіраўнік прыродаахоўнага ведамства падкрэсліў, што з кожным годам пытанням экалогіі і аховы навакольнага асяроддзя ўдзяляецца ўсё больш увагі. Удасканальваецца экалагічнае заканадаўства, грамадства становіцца больш экалагічна адказным.

— Сёння экалогія — гэта краіна, — зрабіў выснову Сяргей Масляк. — У Ecology Expo — 2025 прынялі ўдзел 183 экспаненты, за 2,5 дні выставу наведалі больш за 5000 чалавек, падпісаны шэраг пагадненняў, дарожных карт, кантрактаў. Я ўпэўнены, што гэта толькі пачатак вялікага шляху. Мы ўзялі пэўную планку, ніжэй за якую ўжо не трэба апускацца.

**Ecology Expo — гэта ўнікальная пляцоўка для дыялогу, абмену вопытам, для дэманстрацыі самых інавацыйных рашэнняў у сферы зялёных тэхналогій.**

Сяргей Масляк выказаў шчырую падзяку арганізатарам і ўдзельнікам выставы і пажадаў далейшага паступальнага руху на карысць нашай Беларусі.

**Напрыканцы III Міжнароднай спецыялізаванай экалагічнай выставы Ecology — Expo 2025 адбылося ўзнагароджанне яе ўдзельнікаў. Так, пераможцам у спецнамінацыі «Самы цікавы стэнд» (паводле сімпатый наведвальнікаў) стаў Магілёўаблводаканал, які прадставіў макет водазабеспячэння і водаадвядзення горада. На ім у дэталях можна было паглядзець на кругаварот вады ад свідравіны да кватэры і ад апошняй да станцый ачысткі. А «Самай пазітыўнай і дружалюбнай кампаніяй» было прызнана УП «Мінскводаканал».**

**Александрына ПАРШЫНА,**
**фота аўтара.**

# «АЛІЎЕ» — СА СВАЙГО ГАРОШКУ

**Кансервавая галіна развіваецца ў кірунку імпартазамяшчэння**

Атрыманы на палях ураджай важна яшчэ і перапрацаваць. У развіцці кансервавай галіны Беларусі стаўка зроблена на вытворчасць імпартазамяшчальнай прадукцыі. Аб гэтым у час рэспубліканскага навукова-практычнага семінара кіраўнікоў і спецыялістаў кансервавай галіны «Стратэгія развіцця галіны: вынікі і перспектывы» журналістам расказаў намеснік старшыні канцэрна «Белдзяржхарчпрам» Анатоль УЛАСЕВІЧ.






У галіне назіраецца дынаміка. «Сёння вытворцы і Навукова-практычны цэнтр па харчаванні Нацыянальнай акадэміі навук працуюць як адно звяно. Гэта значыць, усе распрацоўкі, якія праводзяць НАН, у прыватнасці па плодаагароднінавай прадукцыі, укараняюцца ў вытворчасць, — расказаў ён. — Нават у мінулым годзе са 122,7 тысячы тон выраблена прадукцыі ў 82 працэнтах — гэта імпартазамяшчальная прадукцыя. Самае галоўнае, што мы і ў дзіцячым харчаванні, і ў прадуктах для дарослых замясцілі імпарт».

Анатоль Уласевіч таксама звярнуў увагу, што ў стратэгіі развіцця галіны на будучую пяцігодку асноўнымі кірункамі застаюцца мадэрнізацыя і развіццё сыравіннай базы. «Мы хочам задзейнічаць усе нашы вытворчыя магутнасці. Абсталяванне, якое будзе ўсталёўвацца на новых прадпрыемствах, павінна быць загружана на 100 працэнтаў, — падкрэсліў ён. — І самае галоўнае, што адлюстравана ў гэтай стратэгіі: згодна з даручэннем кіраўніка дзяржавы, мы павінны выраблять плодаагароднінную, кансервавую прадукцыю ў большасці выпадкаў на ўласнай сыравіне. Свае буракі, бульба, морква, цыбуля, яблыкі, ягады, грыбы... У тым ліку для нарошчвання экспарту. Бо наша прадукцыя смачная і якасная. У развіцці сыравіннай базы чакаецца комплексная работа з фермерамі, уласнымі падсобнымі гаспадаркамі».

У якасці прыкладу Анатоль Уласевіч прывёў работу Быхаўскага кансервавага завода. Ён працуе з прыватнымі пастаўшчыкамі, фермерамі — пастаўляе ім насенне, сродкі аховы, угнаенні. «Каб прадпрыемства працавала, неабходна сыравіна. І тут пытанне якаснай сыравіны», — адзначыў ён.



**На прадпрыемстве цяпер ідзе перапрацоўка гароху — на палях ужо збіраюць ураджай гэтай культуры. Укладанне сродкаў у мадэрнізацыю, выпуск якаснай прадукцыі, попыт у спажыўцоў — усё гэта дало магчымасць павялічыць выпуск прадукцыі на 20 працэнтаў. «У гэтым годзе мы засадзілі зялёным гарошкам 750 га — на 250 больш, чым у мінулым. За суткі вырабляем да 300 тысяч слоікаў гарошку па 425 мл. Можам паралельна запусціць другую лінію і выпускаць агуркі ці сок, — расказала начальнік вытворчай лабараторыі завода Таццяна АЛІФЕРЧЫК. — На заводзе ідзе мадэрнізацыя — усталявана лінія асептычнага кансервавання для вытворчасці кабачковага, гарбузовага, яблычнага, маркоўнага пюрэ».**

**Паводле БелТА.**
**Фота БелТА.**

## Тым часам

### НА ХЛЕБНАЙ НІВЕ — ТРАНСПАРТНІКІ

Надзейнае плячо аграрыям працаўнікі транспартнай галіны падстаўляюць у кожную ўборачную кампанію. Не стала выключэннем і цяперашняя: свой уклад у забеспячэнне харчовай бяспекі краіны ўносяць прадпрыемствы аўтамабільнага і чыгуначнага транспарту, дарожнай гаспадаркі.

Як паведамілі ў Міністэрстве транспарту і камунікацый, да бітвы за ўраджай падключыліся нават арганізацыі воднага транспарту: Беларускае рачное параходства і Днепрабугводшлях дапамагаюць земляробам тэхнікай і працоўнымі рукамі.

У гушчы жніва — работнікі і спецтэхніка дарожных арганізацый краіны — аўтадараў. На хлебнай ніве працуюць трактары, пагрузчыкі і грузавыя МАЗы дарожнікаў. У палях краіны сёння знаходзіцца 13 работнікаў і 7 адзінак тэхнікі РУП «Віцебскаўтадар», 12 работнікаў і 4 адзінкі тэхнікі РУП «Гроднааўтадар», 4 работнікі і 2 адзінкі тэхнікі РУП «Мінскаўтадар-Цэнтр». Таксама дарожнікі вырашаюць яшчэ адну важную задачу — гарантаванне бяспечнай эксплуатацыі аўтамабільных дарог у перыяд транспарціроўкі ўраджаю.

Працуюць на ўборцы і некалькі дзясяткаў работнікаў Беларускай чыгункі: машыністы і іх памочнікі, манцёры пуці, слесары-рамонтнікі, а таксама прадстаўнікі іншых чыгуначных прафесій. Акрамя таго, у склад Беларускай чыгункі ўваходзяць 5 сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, дзе таксама актыўна ідзе жніво. Іх агульная ўборачная плошча складае звыш 10,7 тыс. га (у тым ліку: збожжавыя і зернебабовыя — 7,8 тыс. га, азімы рапс — 2 тыс. га, кукуруза на зерне — 930 га).



**Алена ЕМЯЛЬЯНАВА.**
**Фота дадзена Міністэрствам транспарту і камунікацый.**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», ул. Немига, 40, пом. 46, офис 2, г. Минск, 220004. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Пинский автобусный парк», Брестская обл., г. Пинск, ул. Брестская, 111. УНП 200298320 |
| **Оператор ЭТП/ Адрес ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», ул. Немига, 40, пом. 46, офис 1, г. Минск, 220004, **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов – Автобус МАЗ 152062,** № кузова Y3M15206280000462, рег. знак АВ 2921-1, 2008 г. в., по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Брестская, 111.

**Начальная цена с НДС 20 % – 17 640,00 руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней со дня завершения электронных торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов: 5 (пяти)** рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение **6 %** от цены продажи лотов в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 16.07.2025

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 22.09.2025.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 19.09.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 29-154-34-35. E-mail: auction@cpo.by**

# ЗАХАВАЦЬ СМАК ЛЕТА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Як адзначыла **намеснік старшыні праўлення Белкаапсаюза Аксана СКІНДЭР**, любы жыхар нашай краіны, нават з самых аддаленых куткоў, мае магчымасць здаць лішкі сельскагаспадарчай прадукцыі. Па яе словах, колькасць людзей, якія актыўна далучаюцца да нарыхтовак, расце, і, што характэрна, усё часцей гэта маладыя энтузіясты, якія з цікавасцю асвойваюць новыя культуры і эксперыментуюць на сваіх прысядзібных участках.

Сёння ў краіне функцыянуе шырокая сетка прыёмных пунктаў: 773 нарыхтоўчыя аб'екты, з якіх 63 раз'язныя нарыхтоўшчыкі працуюць круглы год. У розныя сезоны да работы далучаецца ад 500 да 1000 пазаштатных спецыялістаў. Актыўна працуе і гандлёвая сетка: больш чым 3000 магазінаў у сельскай мясцовасці прымаюць прадукцыю, што забяспечвае максімальную даступнасць паслугі



для насельніцтва. За сем месяцаў гэтага года арганізацыямі спажывецкай кааперацыі было нарыхтавана сыравіны на суму 287,5 мільёна рублёў, у тым ліку насельніцтву выплачана каля 162 мільёнаў рублёў. То-бок, больш за 57 % ад агульнага аб'ёму закупак прыпадае на прадукты, якія здаюць менавіта жыхары, а не юрыдычныя асобы.

Асабліва актыўна пастаўляюцца агуркі, памідоры, бульба, а таксама культурныя ягады — чорная і чырвоная парэчкі, слівы, алыча, чарнаплодная рабіна. Дарэчы, па словах Аксаны Скіндэр, сёлета ў нарыхтоўшчыкаў назіраецца стабільны рост аб'ёмаў. Так, закупкі агуркоў склалі 3,2 тысячы тон (на 15 % больш, чым летась), памідораў — 1,8 тысячы тон (на 3 % больш), капусты — 4,4 тысячы тон, бульбы нарыхтавалі на 40 % больш у параўнанні з мінулым годам. Таксама на міжсезонне плануецца закупіць і закласці для рэалізацыі больш чым 3,5 тысячы тон яблыкаў, якія, акрамя ўсяго іншага, яшчэ і выдатная сыравіна для вырабу соку (яго выхад складае 72 %).

Асобна намеснік старшыні праўлення спынілася на пытаннях якасці і бяспечнасці прадукцыі, што закупляецца. Уся яна праходзіць абавязковую праверку на ўтрыманне радыенуклідаў і іншых небяспечных рэчываў.

«Пытанні якасці становяцца ўсё больш актуальнымі. Перапрацоўчыя прадпрыемствы ўзмацняюць патрабаванні да сыравіны: на выхадзе павінна быць высакаякасная прадукцыя», — адзначыла Аксана Скіндэр.

Спынілася яна і на ўзаемадзеянні з фермерскімі гаспадаркамі. Па словах прадстаўніцы Белкаапсаюза, іх колькасць павялічваецца, тэхналогіі становяцца больш сучаснымі, а якасць прадукцыі — вышэйшай. Штогод заключаецца да 240 дагавораў з фермерскімі гаспадаркамі на пастаўку розных відаў сельгаспрадукцыі — ад кабачкоў і збожжа да яблыкаў і бульбы.

Што датычыцца садавіны, то тут нарыхтоўшчыкам таксама хапае работы. Беларуская садавіна папулярная не толькі ўнутры краіны, але і за яе межамі. Прычым попытам карыстаюцца культуры, якія яшчэ нядаўна былі сапраўднымі экзотамі. Напрыклад, кавун. «Калісьці айчынны кавун быў эксперыментам, а сёння мы бачым яго сярод дасягненняў. Ён не саступае па якасці імпартным аналагам і стаў традыцыйным для беларускага рынку», — падкрэсліла прадстаўніца Белкаапсаюза. Таксама ў шэрагу папулярных — абрыкосы, дыні, вінаград ды розныя сарты сліў.

Працягваючы тэму экспарту, Аксана Скіндэр зазначыла, што гэты кірунак дзейнасці быў і застаецца прыярытэтным. Сёлета прадукцыі і сыравіны, закупленай ці перапрацаванай арганізацыямі спажывецкай кааперацыі, было адгружана за мяжу на суму каля 23 мільёнаў долараў (рост — 116,5 %). З іх гародніны і садавіны — на 97 тысяч долараў, мяса буйной рагатай жывёлы — на 15,2 мільёна долараў. Асноўны рынак збыту —Расійская Федэрацыя, наша прадукцыя пастаўляецца ў 27 яе рэгіёнаў. Акрамя таго, пастаўкі ідуць у Казахстан, Кітай, Камбоджу, Тайланд, Азербайджан, В'етнам і іншыя краіны. На экспарт адпраўляюцца як агародніна і садавіна (бульба, буракі, морква, цыбуля, яблыкі), так і ягады (чарніцы, маліны, буякі, чорныя парэчкі), а таксама грыбы і мяса.

**Міхаіл ДАНІЛКОВІЧ.**

## У 2025 ГОДЗЕ ЗАКУПЛЕНА

- ✓ **7** тысяч тон **БУЛЬБЫ** (у тым ліку 4,6 тысячы тон у насельніцтва);
- ✓ **15** тысяч тон **АГАРОДНІНЫ** (з іх 12 тысяч у насельніцтва);
- ✓ **3** тысячы тон **ПЛАДОЎ і ЯГАД** (з якіх 2,1 тысячы тон закуплена ў жыхароў).





## ЗАКУПАЧНЫЯ ЦЭНЫ НА СЕЛЬГАСПРАДУКЦЫЮ

- ✓ **БУЛЬБА** — ад **0,80 да 1,30 рубля** за кілаграм;
- ✓ **АГУРКІ** — **2–2,5 рубля**;
- ✓ **ПАМІДОРЫ** — **2–3,5 рубля**;
- ✓ **КАПУСТА** белакачанная — **0,40—0,70 рубля**;
- ✓ **ЧАСНОК** — **5–6 рублёў**;
- ✓ **БУЯКІ** — **10—13 рублёў**;
- ✓ **ЯБЛЫКІ** таварныя — **3—3,5 рубля**;
- ✓ **ЯБЛЫКІ** для прамысловай перапрацоўкі — **0,30–0,35 рубля**;
- ✓ **ЛІСІЧКІ** — **3—8 рублёў**;
- ✓ **МАЛІНЫ** — **7—9,5 рубля**.

ОАО «КОМПЛЕКТ»
уведомляет своих акционеров
О ПРОВЕДЕНИИ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ
4 сентября 2025 года в 15.00
по адресу: г. Минск, ул. Энгельса, 34 (каб. № 212)

Повестка дня

**Руководствуясь нормами пункта 30 Главы 7 Устава Общества созвать внеочередное общее собрание акционеров ОАО «КОМПЛЕКТ» 4 сентября 2025 года в 15.00 в очной форме, со следующей повесткой дня:**

1. Об увеличении уставного фонда ОАО «КОМПЛЕКТ».
2. Об условиях проведения закрытой подписки на дополнительные простые (обыкновенные) акции ОАО «КОМПЛЕКТ».
3. О результатах закрытой подписки на дополнительные простые (обыкновенные) акции ОАО «КОМПЛЕКТ».
4. О внесении изменений в Устав ОАО «КОМПЛЕКТ».
5. О внесении изменений в Положение о наблюдательном совете ОАО «КОМПЛЕКТ».
6. Об избрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.

**Определить:**
- место проведения – г. Минск, ул. Энгельса, 34, каб. № 212;
- время начала проведения собрания – 4 сентября 2025 г. в 15.00;
- регистрация участников собрания – в день проведения собрания с 14.00 до 14.45 при предъявлении паспорта – для акционеров Общества, паспорта и доверенности – для представителя акционеров;
- форма голосования по вопросам повестки дня – бюллетенями;
- дата составления реестра акционеров и списка лиц, имеющих право на участие в собрании – 29 августа 2025 года.

**Перечень материалов, предоставляемых акционерам для ознакомления при подготовке к проведению собрания:** проект решения внеочередного общего собрания акционеров по вопросам повестки дня, экономическое обоснование целесообразности увеличения уставного фонда Общества, условия проведения закрытой подписки на акции дополнительного выпуска Общества, копия решения Минского горисполкома от 7.08.2025 № 3103 «Об оказании государственной финансовой поддержки», проект изменений в Устав Общества, проект изменений в Положение о наблюдательном совете Общества, сведения о кандидатах для избрания в состав наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.

**Время и место ознакомления акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания:** с 25 августа по 3 сентября 2025 года в рабочие дни с 8.00 до 16.00 с перерывом с 12.20 до 13.00 по адресу: г. Минск, ул. Энгельса, 34 (приемная), в день проведения собрания 04.09.2025 – с 8.00 до 14.30 по месту его проведения.

УНП 100377927

***Наблюдательный совет.***

В объявление о проведении торгов по продаже имущества Совместного общества с ограниченной ответственностью **«Петрофф Плюс»**, опубликованное в газете «Звязда» № 152 (30540) от 09.08.2025, вносится следующее изменение:

**Лоты №№ 4, 5, 6 объединяются в один лот под № 4 с начальной ценой 1 026 798,96 руб. без НДС.**

УНП 190861019

# БАБРЫ І ЛЮДЗІ

## Як дачнікі і звяры не могуць падзяліць лясную сцежку



«Для нас гэта насамрэч «дарога жыцця»! Дапамажыце нам вярнуць яе!» — звярнулася ў рэдакцыю Тацццяна, адна з дачніц аднайменнага садовага таварыства пад Заслаўем, ад імя многіх яго жыхароў.

«Тацццяна» — не адзіны дачны пасёлак, які пакутуе ад таго, што частку дарогі да электрычкі захапілі бабры: у дажджлівае надвор'е гэты яе ўчастак ператвараецца ў непраходную багну. Побач ёсць яшчэ адно садовае таварыства «Ніва». І цяпер, кажуць людзі, бабры літаральна «адразаюць» іх ад чыгуначнай станцыі.

### «БЫВАЕМ АДРЭЗАНЫЯ АД ЭЛЕКТРЫЧКІ»

Дарога ад электрычкі да дач таварыстваў «Тацццяна» даўжынёй каля трох кіламетраў. Карыстаюцца ёю таксама жыхары СТ «Ніва», «Эффект» і вёскі Малая Валоўшчына, распавядае суразмоўніца.

— Яшчэ 10 гадоў таму гэта была цудоўная дарога: спачатку ідзеш па асфальце да піянерскага лагера, потым — праз лясок. Далей вяла ўтаптаная шырокая сцяжынка, праз рэчку — масток (бетонная пліта). Такая прагулка заўсёды была ў радасць, можна было і на веласіпедзе праехаць. Узімку — таксама проста прыгажосць. Тут многія жывуць круглы год, у асноўным пенсіянеры, і ходзяць па гэтай дарозе ледзь не кожны дзень. Дзяцей, унукаў праводзяць, сустракаюць, таму што гэта самая блізкая дарога да электрычкі.

Бывала, «дарога жыцця» падмакала вясной або летам пасля дажджоў, але хутка прасыхала, успамінае суразмоўніца.

— Каля рэчкі, за мастком, яшчэ ў ліхія 90-я людзі бульбу саджалі дадаткова, для падтрымкі сямейнага бюджэту, — распавядае яна. — Месца было сухое.

Але потым рэчку аблюбавалі бабры, і мясцовасць пачала забалочвацца.

— Вада ў рэчцы паднялася, масток заліло. Асабліва калі ішлі дажджы, праз масток уже нельга было прайсці — вада вышэй костачкі.

Спачатку дачнікі ставіліся да новых суседзяў з разуменнем, бо, прайшоўшы метраў 150, абмінуўшы масток, можна было па суседняй дарожцы трапіць да свайго дачнага ўчастка. Але бабрам мясцовасць прыйшлася даспадобы.

— Цяпер там цэлая калонія баброў і хаткі велізарныя. У выніку ў дажджлівыя дні знікае і тая дарога, дзе мы абыходзілі раней — праз яе вада пераліваецца з аднаго вадаёма ў другі, — кажа суразмоўца. — Атрымліваецца, мы бываем адрэзаныя ад электрычкі. Немагчыма ні на веласіпедзе праехаць, ні на машыне.

І, нават пераадолеўшы гэтую перашкоду, трапляеш у топкі бруд, у які ператвараўся наступны ўчастак (метраў 300-400) некалі любімай дачнікамі дарогі праз лес.

— Калі там праходзіць машына, вельмі вялікія каляіны, — наракае Тацццяна. — Нават у спякоту бруд там ніколі не прасыхае. Бабры з'явіліся два гады таму, і для нас гэта гора, таму што дарога важная для пенсіянераў, якія тут жывуць. Гэта паважаныя пажылыя людзі, старажылы нашага пасёлка.

### «ХОЦЬ БЫ МАСТОК ПАДПРАВІЦЬ...»

— Вось і сталі мы змагацца за сваю дарогу, — распавядае суразмоўніца. — Сталі пісаць усюды: у Мінпрыроды, у Мінскі аблвыканкам, райвыканкам, Ждановіцкі сельсавет. Нам адказвалі, што бабры жывуць у натуральнай зоне іх пражывання і чапаць іх нельга: яны пад аховай дзяржавы. А гэта лясная дарога — самавольная, ні на чыім балансе (хоць мы ўсе ёю карысталіся здаўна).

Год таму, здавалася, справа зрушылася з мёртвай кропкі.

— Было пасяджэнне ў Мінскім аблвыканкаме, — кажа Тацццяна. — На гэтым пасяджэнні быў наш прадстаўнік, Ірына Юша, жыхарка нашага дачнага пасёлка. Яна ўзяла з сабой усе нашы звароты і адказы на іх. Былі прадстаўнікі райвыканкама і Ждановіцкага сельскага Савета, прысутнічалі журналісты. Было дадзена ўказанне, каб да пачатку дачнага сезона, гэта значыць да 1 красавіка 2025 года, зрабіць і масток праз рэчку, і папраўвіць абыходную дарогу, і нават тыя 300 метраў, дзе не прасыхае бруд.

Але прайшоў красавік, потым май, і вось ужо завяршаецца жнівень, а ніякіх зрухаў па гэтым важным для іх пытанні дачнікі не заўважылі.

### «ГЭТА ФАКТЫЧНА ЗЕМЛІ ЛЕСАФОНДУ»

***Што кажуць у аддзеле будаўніцтва Мінскага райвыканкама?***

— У лютым гэтага года прадстаўнікі СТ «Тацццяна» і «Ніва» былі на прыёме ў Мінскім аблвыканкаме, — адзначае **начальнік аддзела будаўніцтва Мінскага раённага выканаўчага камітэта Сцяпан ЧУЧКОЎ**. — Яны патлумачылі, што ходзяць да чыгуначнай станцыі «Зялёнае» праз лес і масток (бетонная пліта з уваранымі ў яе поручнямі), які на той момант быў затоплены. Была накладзена рэзалюцыя: аказаць садзейнічанне. Нашы спецыялісты пабывалі там, ацанілі сітуацыю. Пліта, сапраўды, размешчана ў вадзе. Але там — лясны масіў, гэта фактычна землі лесафонду. Тэхнічна немагчыма паставіць там вежавы кран, каб прыўзняць пліту. Гэтая інфармацыя была дадзена і да аблвыканкама, і да дачнікаў. Мы ім гэта патлумачылі, і яны гэтую пазіцыю прынялі. З нагоды падсыпкі дарогі ад іх зваротаў не паступала. Тая частка шляху да электрычкі, якая падтопліваецца, — гэта самавольная сцяжынка праз лес. Яе няма на карце, яна не знаходзіцца ні на чыім балансе. Разам з тым у дачнікаў ёсць «афіцыйная» дарога ў абход затопленага мастка: шлях атрымліваецца даўжэйшы толькі на 155 метраў. З нагоды таго, што і ён бывае затоплены ў дажджлівае надвор'е, зваротаў і скаргаў ад дачнікаў не паступала.

### У ПРАЦЯГ ТЭМЫ

— Літаральна днямі старшыня Ждановіцкага сельскага савета прыехаў з намі пагаварыць, — працягвае свой аповед дачніца Тацццяна. — Сказаў, спецыялісты абследавалі мясцовасць, пад'ехаць з тэхнікай няма магчымасці. Зрэшты, нейкія варыянты дзеянняў, каб прыпадняць масток, у ходзе абмеркавання мы ўсё ж сумеснымі намаганнямі адшукалі. Цяпер чакаем, што вырашыць старшыня.

Але гаворка вядзецца ўжо толькі пра масток, кажа Тацццяна. Напрыклад, пра 300 метраў лясной дарогі, дзе не прасыхае гразь, размова больш не ідзе. Тым больш, ніякія меры па рамонце і аднаўленні «дарогі жыцця» не будуць дзейсныя, пакуль бабры гаспадараць у гэтых месцах, дадае яна.

З асноўнага спіса жывёл, уключаных у трэцяе выданне Чырвонай кнігі Беларусі, зацверджанае ў 2004 годзе, рачнога бабра выключылі і аднеслі да паляўнічых відаў. У той жа час звярок працягвае заставацца ў дадатку да Чырвонай кнігі Беларусі, дзе пазначаны як від, які патрабуе ўвагі. Прыкладна стагоддзе таму баброў на тэрыторыі Беларусі практычна не заставалася. Сёння іх папуляцыя ўжо досыць вялікая. І дачнікі СТ «Тацццяна» — далёка не адзіныя, хто пакутуе ад «бабровай актыўнасці».

### «БАБРЫ ЖЫВУЦЬ У СВАІМ АСЯРОДДЗІ ПРАЖЫВАННЯ, А НЕ Ў САДОВЫМ ТАВАРЫСТВЕ»

***Што кажуць у тэрытарыяльных органах Мінпрыроды?***

— Працэдура вымання дзікіх жывёл з навакольнага асяроддзя вызначаецца правіламі рэгулявання распаўсюджвання і колькасці дзікіх жывёл, — каментуе сітуацыю **начальнік аддзела кантролю за аховай і выкарыстаннем зямель, нетраў, біяразнастайнасці асабліва ахоўных відаў Мінскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Тацццяна БАС**. — Адносна сітуацыі, што разглядаецца,



рэгуляванню распаўсюджвання і колькасці падлягаюць дзікія жывёлы, якія прычыняюць шкоду жыццю, здароўю і маёмасці грамадзян, юрыдычных асоб. У гэтых мэтах пры наяўнасці фактаў прычынення дзікімі жывёламі шкоды маёмасці фізічных асоб раённым выканаўчым камітэтам ствараецца камісія з удзелам прадстаўнікоў арганізацый, фізічных асоб, якім нанесены ўрон, і карыстальнікаў паляўнічых угоддзяў. Камісія праводзіць абследаванне гэтых месцаў са складаннем актаў, у якіх указваюцца мерапрыемствы па рэгуляванні распаўсюджвання і колькасці дзікіх жывёл (з выманнем або без вымання дзікіх жывёл), і юрыдычная асоба, якая дапускаецца да правядзення работ па рэгуляванні распаўсюджвання і колькасці дзікіх жывёл (карыстальнік паляўнічых угоддзяў, арганізацыі, якім нанесены ўрон, іншыя арганізацыі), і каляндарны час правядзення гэтых работ.

Магчыма рэгуляванне колькасці бабра рачнога без вымання яго з асяроддзя пражывання на зямельных участках і (або) водных аб'ектах, на якіх паселішчы баброў не дапускаюцца, па пераліку, вызначаным камісіяй, шляхам разбурэння бабровых плацін, нор і хатак. Пры прыняцці рашэння камісіяй аб выманні дзікай жывёлы здабыча жывёл у мэтах рэгулявання іх распаўсюджвання і колькасці ажыццяўляецца на падставе дазволу на выманне дзікіх жывёл з асяроддзя іх пражывання, які выдаецца Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя ў парадку, установленым Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, прыладамі і спосабамі, названымі ў дазволе і ў адпаведнасці з правіламі палявання, падкрэслівае спецыяліст.

— У дадзеным выпадку такая камісія збіралася і выязджала ў СТ «Тацццяна» і «Ніва». Падстаў для вымання баброў з іх прыроднага асяроддзя пражывання камісіяй не ўстаноўлена, — кажа Тацццяна Бас. — Варта звярнуць увагу, што праведзенае будаўніцтва «мастка» праз раку Поплаў і «дарогі» з'яўляецца незаконным, бо на тэрыторыі ляснога фонду ў Бараўлянскім спецлясгасе не лічыцца на балансе ўказаны «масток» і не зроблены адвод зямлі пад «дарогу». Непасрэдны землекарыстальнік гэтай тэрыторыі — Бараўлянскі спецлясгас. У выніку пасялення на рацэ баброў, іх жыццядзейнасці (у прыватнасці будаўніцтва плацін) у дадзеным месцы адбылося натуральнае падтопліванне тэрыторыі ляснога фонду. Бабры жывуць у сваім асяроддзі пражывання, не ў садовым таварыстве, а на тэрыторыі ляснога фонду. Да нядаўняга часу яны былі ў Чырвонай кнізе. Папуляцыю аднаўлялі некалькі дзесяцігоддзяў. Дзякуючы ахоўным мерапрыемствам атрымалася развіць яе да такой ступені, што яна ўжо можа падтрымліваць сябе самастойна. І падстаў для вымання баброў з натуральнага асяроддзя, паўтаруся, мы не знайшлі.

Сёння зваротаў з нагоды праблем у сувязі з блізкім суседствам чалавека з бабрамі прыходзіць вельмі шмат, канстатуе суразмоўніца. Нямала зваротаў таксама па лісах і ваўках, іншых лясных насельніках, якія прыходзяць у двары невялікіх населеных пунктаў і нават часам — у буйныя гарады. Прырода адаптуецца да чалавека і хутка змяняецца.

— А ў дадзеным выпадку, на мой погляд, вырашэнне пытання — у тым, каб разабрацца з маршрутам, якім людзі могуць дабірацца ў Мінск і з Мінска. Напрыклад, на шашы побач з вёскай Малая Валоўшчына ёсць прыпынак, дзе ходзяць аўтобусы, і ён зусім блізка ад абодвух садовых таварыстваў — бліжэй, чым чыгуначная станцыя. Можа быць, замест таго, каб ваявацца з бабрамі, дачнікам варта было б звярнуцца з просьбай запусціць больш рэйсавых аўтобусаў або маршрутак да гэтага прыпынку. А што датычыцца небяспекі забалочвання садовых участкаў, мы абследавалі тэрыторыю СТ. Там, дзе рака бліжэй за ўсё падступае да дачных участкаў (20-30 м), яе рэчышча чыстае.

### І ШТО Ў ВЫНІКУ?

Такім чынам, гэта тая класічная сітуацыя, калі ўсе зацікаўленыя бакі быццам бы маюць рацыю, але пытанне так і застаецца адкрытым. Дадам, што аўтатранспартныя зносіны паміж Мінскам і вёскай Малая Валоўшчына (каля якой знаходзяцца абодва садовыя таварыствы), сапраўды, ёсць. Але электрычкі ходзяць значна часцей за аўтобусы, а чыгуначны праезд каштуе танней за маршрутку. Што для пенсіянераў немалаважна.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ОАО «Н Холдинг»**
**проводит повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности**
**ОАО «Минский завод «Термопласт»**

**Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Н Холдинг» по организации и проведению аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **ЛОТ № 1** | Капитальное строение с инв. № 500/С-22919, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Кнорина, д. 50. Площадь – 4056,3 кв. м. Наименование – Здание административно-хозяйственное, литер А 7/к-кп. Назначение – Здание административно-хозяйственное. Обременение: аренда. Капитальное строение расположено на земельном участке с кадастровым номером 500000000009007867 площадью 0,1422 га, предоставленном ОАО «Минский завод Термопласт» на праве аренды (срок действия: по 30.04.2031). На земельном участке установлены следующие ограничения (обременения): охранная зона линий связи и радиофикации, площадь 0,0133 га; охранная зона сетей и сооружений водоснабжения, площадь 0,0230 га; охранная зона сетей и сооружений канализации, площадь 0,0038 га | | | | |
| **Начальная цена (стоимость) (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **7 852 320,00** | **Задаток, BYN** | **785 232,00** | **Шаг аукциона** | **5 %** |
| **Сведения о продавце, его местонахождение и контактные телефоны** | ОАО «МИНСКИЙ ЗАВОД «ТЕРМОПЛАСТ» Республика Беларусь, 220103, г. Минск, ул. Кнорина, 50. Тел. +375172811340. E-mail: office@oaotermoplast.by | | | | |
| **Сведения об организаторе аукциона** | ОАО «Н Холдинг» 220029, г. Минск, пр-т Машерова, 11, пом. 1. Тел. 8 029 133 03 33 (Елена) | | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | Договор купли-продажи должен быть заключен в течение **10 (десяти) рабочих дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Возмещение затрат на организацию и проведение аукционов** | Победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, в течение 5 (пяти) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного организатором аукциона, а также в течение 3 (трех) рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона выплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 1 % от цены продажи предмета аукциона на основании счета, выставленного организатором аукциона | | | | |
| **Условия оплаты** | Оплата задатка производится резидентами в белорусских рублях (нерезидентами в белорусских рублях или в долларах США по курсу НБ РБ на дату оплаты) в срок не позднее даты подачи заявления на участие в аукционе на следующие банковские реквизиты: р/с BY79 AKBB 3012 0000 1634 1000 0000 (BYN) в ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, 220005, г. Минск, пр-т Независимости, д. 56. Получатель – Открытое акционерное общество «Н Холдинг», УНН 101059240, ОКПО 37392696. Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты объекта, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Место, дата и время приема заявлений на участие в аукционе** | Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **по 21 сентября 2025 года (включительно)** в рабочие дни с 9.00 до 16.55 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35-1 | | | | |
| **Место, дата и время проведения аукциона** | Открытый аукцион состоится **22 сентября 2025 года** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35-1, зал совещаний ОАО «Н Холдинг» | | | | |

Организатор аукциона после опубликования извещения о его проведении вправе в любое время без объяснения причин, но не позднее чем за 3 календарных дня до даты проведения аукциона, указанной в извещении о проведении аукциона, отказаться от его проведения



**Брестский филиал**
**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
**извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества, принадлежащего**
**РУП «Брестское отделение Бел.ж.д.»**

| Наименование и местоположение объекта | Начальная цена продажи, руб. | Срок договора аренды |
|---|---|---|
| **ЛОТ № 1:** право заключения договора аренды недвижимого имущества: часть производственного цеха, площадью 251,6 кв. м в капитальном строении с инв. № ЕГРНИ 100/С-39795 по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Лейтенанта Рябцева, 7/2, покрытие площадью 35,0 кв. м в капитальном строении с инв. № ЕГРНИ 100/С-49205 по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Лейтенанта Рябцева, 7/3 | 941,41 | 3 года |

**Организатор аукциона:**
**Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», 224005, г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел.: 80162 40 87 01, 40 87 41**

**Аукцион состоится 05 сентября 2025 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона **www.ocenkabrest.by,** также можно узнать по телефонам: **8 (0162) 40-87-41, 40-87-01**

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь (https://au.nca.by/auction/32700)

УНП 201028245


# ДРЭС-КОД ДЛЯ ШКАЛЯРА

## У СТЫЛІ АВЕРСАЙЗ

Міністэрствам адукацыі прадпісаны для школьнікаў дзелавы стыль, які рэгламентуе пэўны набор адзення. Для хлопчыкаў гэта пінжак, камізэлька, штаны, кашуля з кароткімі або доўгімі рукавамі, гольф, гальштук. Для дзяўчынкі — пінжак, камізэлька, спадніца, штаны, блузка з кароткімі або доўгімі рукавамі, гольф, сарафан, сукенка. У зімовы час гардэроб можна папоўніць трыкатажным світарам. Засталося толькі вызначыцца з цэнамі. Накіроўваемся ў адзін з магілёўскіх гандлёва-забаўляльных цэнтраў. Падлеткі пачынаючы з 12 гадоў, а некаторыя і раней, аддаюць перавагу не дзіцячым аддзелам крам, а модным буцікам. Нават пры выбары школьнага адзення яны набываюць рэчы ў папулярным сёння стылі аверсайз. Гэта адзенне свабоднага крою, вельмі аб'ёмістае, быццам бы знятае з чужога пляча.

> **Магіляўчанка Юлія Падольская дачку Марыю, якая ідзе сёлета ў 7 клас, пачала збіраць у школу з сярэдзіны ліпеня. Прызнаецца, што вялікіх зніжак, як перад пачаткам новага навучальнага года, у гэты час яшчэ няма, але можна трапіць на прыемныя ва ўсіх адносінах акцыі: напрыклад, шорты на фізкультуру, якія каштавалі 60 рублёў, ёй пашчасціла купіць усяго за 10 (аддала яна, як і трэба, 60 рублёў, але пасля пакупкі 50 вярнуліся на дысконтную картку). Вельмі выгадная прапанова.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*





— Плюс ад ранняй падрыхтоўкі да школы ў тым, што можна рабіць гэта не спяшаючыся і пазбегнуць перадвосеньскага ажыятажу, калі ў горад вяртаюцца з адпачынку дзеці і пачынаюцца іх праменады з бацькамі па крамах, — расказвае Юля. — Вядома, што адзенне лепей купляць бліжэй да пачатку заняткаў, каб дзіця, якое знаходзіцца ў стадыі актыўнага росту, не вырасла з вопраткі да таго, як пачне яе насіць. Па блузкі і спадніцу мы пайшлі ў канцы ліпеня. У адным з буцікоў купілі штаны-палаца за 75 рублёў, модную спадніцу ў шырокую складку з кішэнямі, якія праглядаюцца знізу, дзве кашулі — з кароткімі і доўгімі рукавамі. Гардэробчык абышоўся нам прыкладна ў 240 рублёў. Дачка арыентуецца на стыль аверсайз, дзякуючы якому можна купляць рэчы на некалькі размераў большыя. Гэта дазволіла сэканоміць на камізэльцы і яшчэ адной спадніцы, якія мы набылі летась. У «Мегатопе» купілі модныя лакіраваныя туфлі за 120 рублёў, хаця можна было знайсці і за 60. Але дачцэ вельмі спадабаліся гэтыя.

На школьны рынак, прызнаецца Юля, не звярталася: лічыць, што там лепей адзяваць вучняў малодшых класаў. Меней за ўсё праблем было са сшыткамі і канцтаварамі. Выратавалі танныя сеткавікі, дзе гэты тавар прадаецца з мінімальнай нацэнкай. Некаторых дзяўчынак вабяць абгорткі з малюнкамі, але для Марыі гэта не прынцыпова. Красоўкі для фізкультуры знайшлі на маркетплэйсе за 60 рублёў. Засталося толькі выбраць заплечнік. Маці з дачкой прыглядзелі ў інтэрнэт-краме тры варыянты. Чакаюць, калі тавар падвязуць. Сярэдняя цана — 80—90 рублёў. Можна, канешне, падабраць нешта і танней, пачынаючы ад 50, але гэта, як правіла, не лепшы варыянт. Якасны тавар стартуе ад 90 рублёў.

Юля таксама дала карысную падказку, дзе купляць дапаможнікі па школьных прадметах. Тут трэба ведаць канкрэтных аўтараў, а гэтую інфармацыю настаўнікі выкідваюць у агульны чат дзесьці ў канцы жніўня — адразу ж вакол указаных выданняў пачынаецца нездаровы ажыятаж, і бывае вельмі цяжка купіць патрэбную кніжку. Суразмоўніца ўдакладняе, што ёй прыходзілася нават з Мінска заказваць, бо настаўніца папракала, што вучаніца прыходзіць на ўрок непадрыхтаваная. Цяпер Юля замаўляе дапаможнікі ў папулярнай кніжнай інтэрнэт-краме.

## ГАЙДА НА РЫНАК

З 1 жніўня ў Магілёве на пляцоўцы ААТ «Магілёў Атракцыёны» па Пушкінскім праспекце працуе школьны базар, дзе тавар, па інфармацыі ўпраўлення гандлю і паслуг Магілёўскага гарвыканкама, прапануюць 40 суб'ектаў гаспадарання. Тут у шырокім асартыменце адзенне і абутак для хлопчыкаў і дзяўчынак рознага ўзросту, спартыўны трыкатаж, заплечнікі, канцтавары і іншыя школьныя прылады. Да 31 жніўня рэжым работы аб'екта з 11.00 да 19.00 без перапынкаў на абед і выхадных.

Людзей у будны дзень тут няшмат, але практычна ў кожнай палатцы нехта нешта прымярае. Адна з магілёўскіх крам прапануе адразу і адзенне, і канцтавары, і нават ніжнюю бялізну.

— У нас можна цалкам сабраць дзіця да школы, — усміхаецца прадавец Алена. — Кашулю для першакласніка ў нас можна купіць нават за 13 рублёў. Для падлеткаў — пачынаючы ад 40.

Па словах суразмоўніцы, нарасхват ідуць камізэлькі ўсіх колераў. У школах і гімназіях гэта рэч № 1. Каштуюць яны ў гэтага ўласніка ад 30 да 40 рублёў. А вось касцюмы цяпер амаль не купляюць, прызналася Алена. Бяруць у асноўным асобна штаны, кашулі, спартыўныя фуфайкі.

У палатку ўваходзіць цэлае сямейства — маці з дачкой і сынам. Знаёмімся бліжэй. Жанчыну завуць Святлана, яе дзіця Каця — сямікласніца, Іван — пяцікласнік.

— На базар прыйшлі, таму што тут танней, — кажа Святлана. — Стратэгічны запас да школы робім з канца мая. Хлопчыка апрануць лягчэй. Тыя ж штаны прыглядзелі за 30 рублёў, столькі ж каштуе кашуля на яго, крыху даражэйшы абутак. Адзенне для дзяўчынкі каштуе больш.



## НАЛЯТАЙ, ПАТАННЕЛА

Амаль у кожнай палатцы тавары са зніжкамі. Нехта прадае штаны за 40 рублёў, нехта за — 20. Яшчэ ў адной палатцы распродаж кашуль. Назіраю за дзяўчынай, якая прымярае белую кашулю і модную ў складкі спадніцу, бабуля стаіць побач і захапляецца, ёй убор падабаецца, як, дарэчы, і ўнучцы. «Бяром усё», — кажа пенсіянерка прадаўцу і працягвае 110 рублёў. «Атрымала пенсію і пайшла з унучкай па крамах, яна сёлета ў восьмы клас ідзе, — расказвае жанчына. — Глядзелі адзенне і ў краме, але ёй там нічога не спадабалася. На рынку знайшлі самы прывабны і танны варыянт. Як для яе шытае. Не шкада было і грошы аддаваць».

Сапраўды, выбар на рынку добры. І цэны даволі дэмакратычныя. Прыгожая сукенка тульскай вытворчасці, напрыклад, каштуе 85 рублёў, кітайскі спартыўны касцюм — 95 рублёў, дзявочыя кашулі і спадніцы ў сярэднім — 55 рублёў, штаны — 65-70, хаця ёсць і таннейшыя, пачынаючы ад 35. Да навучальнага года застаецца нямногім больш за тыдзень, і зніжкі на тавар прапаноўваюцца ўсё часцей.

Спецыялісты інспекцыі Дзяржнагляду, між тым, нагадваюць, што трэба звяртаць увагу не толькі на знешнюю прыгажосць, але і клапаціцца пра здароўе школьніка. Бо яму за партай сядзець амаль цэлы дзень у тым школьным адзенні, якое купіце. Перавагу лепш аддаваць тавару з натуральных валокнаў. Пры набыцці заплечніка, асабліва для вучняў малодшых класаў, правярайце, каб былі ў наяўнасці святлоадбівальныя элементы, артапедычная спінка, надзейныя лямкі, і важыць ён павінен не болей чым 700 грамаў. Для вучняў старшых класаў вага дапускаецца да кілаграма. Жадаем не памыліцца з выбарам. Бо як адзенецца дзіця, такі і настрой у яго будзе. Мы ж жадаем усім толькі добрага настрою!

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**




**Кампетэнтна**

## Дысцыплінуе і выхоўвае

Напярэдадні навучальнага года пытанне школьнага адзення вельмі актуальнае і важнае для бацькоў, школьнікаў, педагогаў, і яно значна шырэйшае і глыбейшае, чым проста акуратны выгляд вучня. Школа — не толькі веды, гэта выхаванне ў самым шырокім сэнсе, і знешнасць дзіцяці ў гэтым працэсе адыгрывае далёка не апошнюю ролю. Адзенне дзелавога стылю настройвае на працоўны лад, дысцыплінуе, не адцягвае ад вучобы, служыць згуртаванню калектыву і фарміруе карпаратыўную этыку. У канчатковым выніку — выхоўвае гонар за сваю школу, упэўнены **намеснік міністра адукацыі Аляксандр КАДЛУБАЙ.**

— Падыходы, якія былі выпрацаваны Міністэрствам адукацыі раней у частцы знешняга выгляду школьнікаў, захаваюцца і ў 2025/2026 навучальным годзе, але ўжо на заканадаўчым узроўні. Як усе мы ўжо ведаем, з 1 верасня ўступае ў сілу новая рэдакцыя Кодэкса аб адукацыі, дзе замацавана норма, якая рэгламентуе прысутнасць навучэнцаў на вучэбных занятках у адзенні дзелавога стылю. Выключэнне складаюць выпадкі, прадугледжаныя санітарна-эпідэміялагічнымі патрабаваннямі, — гаворка ідзе пра ўрокі фізічнай культуры і працы. Самі патрабаванні да адзення дзелавога стылю вызначаны Палажэннем аб установе агульнай сярэдняй адукацыі, — зазначыў намеснік міністра.

Па яго словах, адзенне дзелавога стылю ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі выкарыстоўваецца ўжо больш за 10 гадоў. Сёлета ва ўсіх школах і гімназіях па ўзгадненні з навучэнцамі і іх бацькамі прыняты рашэнні па колеравай гаме школьнага адзення — сіні, чорны, шэры, бардовы. Вызначаны яе адзіныя элементы: камізэлька, штаны, пінжак, кашуля, спадніца, сарафан, сукенка, блузка.

— Усё гэта робіцца калегіяльна — навучэнцамі, бацькамі, педагагічнымі работнікамі, — растлумачыў Аляксандр Кадлубай. — Улічваецца спецыфіка ўстановы адукацыі і практыка, якая ўжо склалася, у частцы школьнай формы. Галоўнае — камплект адзення павінен быць шматфункцыянальным, гігіенічным, зручным і, вядома, адпавядаць сучасным кірункам моды.

Ён таксама канстатаваў, што канцэрн «Беллегпрам» распрацаваў шырокі асартымент школьнага адзення, каталог якога ёсць на сайце Мінадукацыі і абнаўляецца штогод. З прапанаваных узораў кожны школьнік можа выбраць канкрэтную мадэль з улікам асаблівасцяў фігуры і ўласнага густу і дапоўніць яго адзінымі элементамі, якія вызначаны кожнай школай.


**Брестский филиал**
**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**

**Лот № 1: капитальное строение с инвентарным номером 100/С-54093 (наименование: свинарник маточный; назначение: здание специализированное животноводства)** площадью 853,8 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, район д. Тельмы-1, на земельном участке с кадастровым номером 121200000001027596 площадью 0,4780 га, составные части и принадлежности: 3 тамбура

| Начальная цена, руб. (без учета НДС) | 185 000,00 | Размер задатка, руб. | 18 500,00 |
|---|---|---|---|

**Продавец:** ОАО «Брестский аграрий», 225003, Брестская обл., Брестский р-н, д. Тельмы-1, ул. Депутатская, 2, тел. 80162549233. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона. **Шаг аукциона:** 5 % от предыдущей названной цены

**Аукцион состоится 11 сентября 2025 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона **www.ocenkabrest.by,** также можно узнать по телефонам: **8 (0162) 40-87-01, 40-87-41**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 10 сентября 2025 г. до 17.00**



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1, www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ООО «Арктраст», г. Минск, ул. Харьковская, 15, помещение 311 |
| **Предмет электронных торгов** | **Начальная цена без НДС, долл. США*** |
| **Лот № 1 – Здание многофункциональное** (Здание специализированное иного назначения), инв. номер 600/С-173782, общей площадью 1515,8 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Петришковский с/с, д. Кирши, ул. Центральная, 17Б/10. Составные части и принадлежности: цокольный этаж (5А1/кз), три пристройки (5Б1/кз, 5В1/кз, 1), два навеса (а, б) | **650 000,00** |
| **Сведения о земельном участке с кадастровым номером 623685704101000230:** предоставлен на праве аренды по 03.05.2026 для строительства и обслуживания здания многофункционального общей площадью 0,1628 га | |
| **Лот № 2 – Здание многофункциональное** (Здание специализированное для ремонта и (или) технического обслуживания автомобилей (в том числе автомобильные заправочные, зарядные и газонаполнительные станции)), инв. номер 600/С-169914, общей площадью 1257,7 кв. м, по адресу: Минская обл., Минский р-н, Петришковский с/с, д. Кирши, ул. Центральная, 17Б/4 | **540 000,00** |
| **Сведения о земельном участке с кадастровым номером 623685704101000221:** предоставлен на праве аренды по 03.05.2026 для строительства и обслуживания здания многофункционального общей площадью 0,1864 га | |

***Цена продажи предмета электронных торгов фиксируется в протоколе о результатах аукциона в сумме в белорусских рублях, эквивалентной цене продажи лота в долл. США по курсу НБРБ на дату проведения торгов**

**Задаток 5 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях по курсу НБРБ на дату внесения платежа на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **3 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 22.09.2025 г. с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:**
заявки на участие в электронных торгах принимаются по **19.09.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 373 21 33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

# ЦАНА БЕСТУРБОТНАСЦІ — ЖЫЦЦЁ ДЗІЦЯЦІ

**Лета і першыя восеньскія месяцы — перыяд павышанай рызыкі дзіцячага траўматызму**

Менавіта ў гэты час, паводле слоў праваахоўных органаў, дзеці часцей аказваюцца без нагляду дарослых. Узрастае колькасць бытавых і вулічных траўмаў — ад падзенняў і ўдараў да цяжкіх пераломаў, транспартных здарэнняў. Больш падрабязна пра небяспекі, якія чакаюць дзяцей у гарадскім і адукацыйным асяроддзі, даведалася карэспандэнт «Звязды».



## РОСЛЫ НЕ ЗНАЧЫЦЬ ДАРОСЛЫ

Афіцыйныя даныя МУС пацвярджаюць сур'ёзнасць сітуацыі. За лета на дарогах краіны загінулі восем непаўналетніх, яшчэ 144 атрымалі траўмы. Кожнае чацвёртае дзіця, якое пацярпела ў аварыі, становіцца інвалідам. Няўважлівасць, перавышэнне хуткасці, адцягванне ўвагі вадзіцеля — частыя таму прычыны. Аднак і самі дзеці часам не валодаюць дастатковымі навыкамі бяспечных паводзін. Прычым гаворка ідзе не толькі пра выпадкі, калі дзіця выбягае на дарогу ці перасякае яе ў неналежным месцы. Падлеткі трапляюць у небяспечныя сітуацыі не радзей — схільнасць да рызыкі і самастойнасці часам становіцца прычынай трагедыі. Асабліва трывожыць рост колькасці выпадкаў удзелу непаўналетніх у кіраванні транспартам — яны садзяцца за руль машын або матацыклаў без правоў, нярэдка ў стане алкагольнага ап'янення. У жніўні, калі школьнікі вяртаюцца ў горад, колькасць такіх здарэнняў значна расце:

— У канцы летніх канікулаў дзеці спрабуюць «нагнаць упушчанае». Таму, на жаль, мы назіраем наступныя сітуацыі: падлеткі садзяцца ў машыны вялікімі кампаніямі, на матацыклы, не маючы правоў, і едуць на дыскатэкі ці так званыя «тусоўкі». Гэта ўжо статыстыка, якая паўтараецца з году ў год, — папярэджвае **старшы інспектар па асобых даручэннях галоўнага ўпраўлення ДАІ Міністэрства ўнутраных спраў Ганна БАНАДЫК.** — Велізарная просьба да бацькоў: удзяліце ўвагу сваім дзецям, не давайце ім доступ да ключоў ад аўтамабіляў, матацыклаў, мапедаў і скутараў.

Нагадаем: дзецям да 16 гадоў можна знаходзіцца на вуліцы без суправаджэння дарослых толькі да 11 гадзін вечара. Акрамя таго, бацькі, з'язджаючы на выхадныя, павінны памятаць: пакінутыя без нагляду падлеткі могуць зладзіць вечарыны, якія нярэдка канчаюцца распіваннем спіртнога, ужываннем псіхаактыўных рэчываў, бойкамі і нават гвалтам. За апошнія месяцы супрацоўнікі міліцыі кожны тыдзень сутыкаліся з такімі выпадкамі. Адзін здарыўся зусім нядаўна ў Жлобіне:

— У чатыры раніцы паступіла паведамленне аб шумнай кампаніі падлеткаў. Міліцыянеры, якія прыбылі на месца, заспелі ў стане алкагольнага ап'янення непаўналетняга, які ўспорваў сабе жывот, пакуль іншыя падлеткі здымалі гэта на відэа, — распавядае **Васіль ДЗЕМІДОВІЧ, намеснік начальніка аддзела па арганізацыі работы інспекцый па справах непаўналетніх УП ГУАПП МУС.** — Падобныя здарэнні разглядаюцца органамі ўнутраных спраў як надзвычайныя і становяцца падставай для распрацоўкі новых мер прафілактыкі.

## РУКІ ПРЭЧ АД ПРАВАДОЎ!

Электрычнасць даўно стала часткай нашага паўсядзённага жыцця, але пры няправільнай эксплуатацыі яна становіцца смяротна небяспечнай. Неабароненыя шчыткі, няспраўныя прыборы і звычайная дзіцячая цікаўнасць становяцца прычынамі цяжкіх траўм. З 2019 года ў Беларусі зафіксавана 33 выпадкі паражэння электрычным токам сярод непаўналетніх, 10 з іх — са смяротным зыходам. У асноўным — з-за пранікнення на энергааб'екты і кантакт з няспраўным электраабсталяваннем.

**Андрэй ВАРАНЦОЎ, намеснік начальніка аддзела электратэхнічнай інспекцыі Дзяржаўнага энергетычнага і газавага нагляду**, адзначае: сёлета ўжо адбылося тры няшчасныя выпадкі. У студзені ў Мінску загінуў 16-гадовы падлетак, які вырашыў зрэзаць правады ў трансфарматарнай падстанцыі; у маі ў Магілёве пацярпела 12-гадовае дзіця, якое дакранулася да правадоў электрычнага шчыта. А ў жніўні ў Мінскай вобласці 17-гадовы юнак залез на высакавольтную апору лініі электраперадачы, спускаючыся, страціў раўнавагу і закрануў кантактны провад сеткі. Хлопец атрымаў 40 % апёкаў цела.

## БЯСПЕЧНЫ ШЛЯХ ДА ВЕДАЎ

Маніторынг стану бяспекі ў школах супрацоўнікі міліцыі праводзяць вось ужо два гады. У красавіку былі наведаны ўсе ўстановы адукацыі краіны. Правяралася абсталяванне ўваходаў і выхадаў замыкаючымі прыладамі, наяўнасць аховы, спраўнасць прапускнога рэжыму, сістэм відэаназірання. Высветлілася, што апошнія ўсё яшчэ рэдкасць для многіх школ. Але камеры відэаназірання аказваюць амаль магічнае ўздзеянне: адно толькі веданне таго, што ўсё, што адбываецца на тэрыторыі школы, фіксуецца, дысцыплінуе дзяцей і дарослых, дапамагае прадухіляць супрацьпраўныя ўчынкі.

Засцерагаць дзіця ад траўм трэба не толькі ўнутры школы, але і на прылеглай да яе тэрыторыі, тым больш што кожны год фіксуюцца трагічныя выпадкі. Да іх нярэдка прыводзяць, здавалася б, банальныя гісторыі — падзенне незамацаванага баскетбольнага кальца або футбольных варот. За два апошнія гады — чацвёра цяжка пацярпелых. У дадатак да гэтага небяспеку ўяўляюць закінутыя будынкі і спадарожныя ім пліты, арматура, бітае шкло, трухлявыя і амаль паваленыя дрэвы. І такія будынкі, паводле слоў Васіля Дземідовіча, былі знойдзены без агароджаў і на тэрыторыі некаторых устаноў адукацыі.

Падобныя факты не застаюцца без увагі: аб іх інфармуюцца кіраўнікі ўстаноў, прымаюцца меры па ўхіленні недахопаў. Сёння большасць выяўленых праблем ужо ліквідавана. Напрыклад, сёлета праверылі больш за шэсць тысяч аб'ектаў вулічна-дарожнай сеткі паблізу месцаў, дзе часта бываюць дзеці: школ, дзіцячых садкоў, паліклінік. У ходзе праверак выяўлена больш за 4800 недахопаў, тры тысячы з іх звязаны з адсутнасцю або дрэнным бачнасцю гарызантальнай дарожнай разметкі. Цяпер, у жніўні, гэтыя недахопы актыўна выпраўляюцца. Абнаўляецца разметка каля школ, прыводзяцца ў парадак дарожныя знакі, ствараюцца бяспечныя зоны для высадкі дзяцей каля школ.

**Аміна НАЗАРАВА.**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ОАО «Н Холдинг» проводит повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности ОАО «Минский завод «Термопласт»**

**Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Н Холдинг» по организации и проведению аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **ЛОТ № 1** | **Изолированное помещение с инв. № 500/D-1002997, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Седых, д. 66, пом. 1. Площадь – 1422,0 кв. м. Наименование – Спортивный комплекс, расположенный на 1 и 2 этажах (пристройка к средней школе № 114). Назначение – Помещение физкультурно-оздоровительного и (или) спортивного назначения. Обременение: аренда** | | | | |
| **Начальная цена (стоимость) (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **1 184 400,00** | **Задаток, BYN** | **118 440,00** | **Шаг аукциона** | **5 %** |
| **Сведения о продавце, его местонахождение и контактные телефоны** | ОАО «МИНСКИЙ ЗАВОД «ТЕРМОПЛАСТ» Республика Беларусь, 220103, г. Минск, ул. Кнорина, 50. Тел. +375172811340. E-mail: office@oaotermoplast.by | | | | |
| **Сведения об организаторе аукциона** | ОАО «Н Холдинг», 220029, г. Минск, пр-т Машерова, 11, пом. 1. Тел.: 8 029 133 03 33 (Елена) | | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | Договор купли-продажи должен быть заключен в течение **10 (десяти) рабочих дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Возмещение затрат на организацию и проведение аукционов** | Победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, в течение 5 (пяти) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона обязаны возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного организатором аукциона, а также в течение 3 (трех) рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона выплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 1 % от цены продажи предмета аукциона на основании счета, выставленного организатором аукциона | | | | |
| **Условия оплаты** | Оплата задатка производится резидентами в белорусских рублях (не резидентами в белорусских рублях или в долларах США по курсу НБ РБ на дату оплаты) в срок не позднее даты подачи заявления на участие в аукционе на следующие банковские реквизиты: р/с BY79 AKBB 3012 0000 1634 1000 0000 (BYN) в ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, 220005, г. Минск, пр-т Независимости, д. 56. Получатель – Открытое акционерное общество «Н Холдинг», УНН 101059240, ОКПО 37392696. Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за объект, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Место, дата и время приема заявлений на участие в аукционе** | Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **по 10 сентября 2025 года (включительно)** в рабочие дни с 9.00 до 16.55 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35-1 | | | | |
| **Место, дата и время проведения аукциона** | Открытый аукцион состоится **11 сентября 2025 года** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35-1, зал совещаний ОАО «Н Холдинг» | | | | |

Организатор аукциона после опубликования извещения о его проведении вправе в любое время, без объяснения причин, но не позднее, чем за 3 календарных дня до даты проведения аукциона, указанной в извещении о проведении аукциона, отказаться от его проведения



Центр Промышленной Оценки

**• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ**
**• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Паритетбанк», г. Минск, ул. Киселева, 61а. УНП 100233809 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. УНП 191224638 (**www.ipmtorgi.by)** |

**Предмет электронного аукциона**

**Административное помещение 158,4 кв. м** (500/D-7988231960).
**Адрес: г. Минск, ул. Мельникайте, 2-40**

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 637 102,13 бел. руб.** (снижена на 20 %)
Шаг торгов – 5 % от начальной цены

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы». Победителем аукциона признаётся участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязаны возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить **вознаграждение организатору торгов 3 %** от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Предыдущая публикация извещения в газете «Звязда» от 15.07.2025

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее, чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 03.09.2025 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.
**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 02.09.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 (17) 310-36-37; +375 (44) 704-92-06.**
**E-mail: auction@cpo.by**

## Панядзелак, 25 жніўня

### Беларусь 1

**6.00, 7.15, 8.20** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**8.15, 18.45** Зона X (16+).
**9.15** Галоўны эфір.
**10.50** Спецыяльны рэпартаж Першага інфармацыйнага (12+).
**11.05, 12.25 Серыял «Непрыгожая сяброўка» (16+).**
**13.25, 15.15 Меладрама «Кухарка-3. Таленты і прыхільнікі» (16+).**
**17.45** Беларуская часінка.
**19.10 Меладрама «Мая чужая дачка» (12+).**
**21.00** Панарама.
**21.50** Зразумелая палітыка.
**22.05 Серыял «След» (16+).**

### АНТ

**6.00, 7.10, 8.10** «Наша раніца».
**7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.10** Контуры.
**10.15** «Жыць здарова!» (16+)
**11.15** «Модны прыгавор» (6+).
**12.10** «Белыя Росы» (12+).
**12.40, 13.15 Фільм «Цыганка» (16+).**
**15.05** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**17.20, 18.20** Інфармацыйны канал (16+).
**19.00** «Яшчэ не вечар» (16+).
**20.10** Вячэрнія навіны.
**21.20** «Прапаганда» (16+).
**21.40 «Доктар Праабражэнскі». Фільм (16+).**
**22.55 Фільм «Сышчыца» (16+).**
**0.55** Час.

### СТБ

